и литературе // Экономика, управление, демография городов европейской России XV–XVIII вв.: история, историография источники и методы исторического исследования: Материалы конференции, Тверь, 18–21 февраля 1999. – Тверь : Изд-во Тверского гос. ун-та, 1999. – С. 141–151.

23. Середа, Н. В. Реформа управления Екатерины Второй. – М., 2004. – 456 с.

24. Смирнов, Я. Е. Купец-историк А. А. Титов в контексте истории культуры российской провинции последней трети XIX – начала XX века. Автореферат диссертации на соискание ученой степени кандидата истор. наук. – М., 2014. – 26 с.

25. Столичные и периферийные города Руси и России в средние века и раннее новое время (XI–XVIII вв.). Тезисы докладов научной конференции. Москва, 3–5 декабря 1996 г. – М., 1996. – 352 с.

26. Столичные и периферийные города Руси и России в средние века и раннее новое время X1–XVIII вв.: Проблемы культуры и культурного наследия. Доклады третьей научной конференции (Муром, 17–20 мая 2001). – М., 2003. – 352 с.

27. Управление городами: прошлое, настоящее и будущее. Материалы научной конференции. (Тверь, 23–24 ноября 2002 г.). – Тверь, 2001. – 256 с.

28. Четырина, Н. А. Сергиевский посад в конце XVIII – XIX вв. (Посад как тип городского поселения). М.; СПб., 2006. – 325 с.

29. Шевченко, Е. А. Воронежское наместничество (1779–1796 гг.): Система управления. – Воронеж : Истоки, 2010. – 311 с.

30. Экономика, управление, демография городов европейской России XV–XVIII вв.: история, историография, источники и методы исторического исследования: Материалы конференции. Тверь, 18–21 февраля 1999. Тверь, изд-во Тверского гос. ун-та, – 1999. – 307 с.

31. Ястребицкая, А. Л. Средневековая культура и город в новой исторической науке – М. : Интерпракс, 1995. – 416 с.

УДК 94(476) “16/1917”

# ІНДЗЕЯНІСЦКАЯ ІНФАРМАЦЫЯ Ў ГАРАДАХ БЕЛАРУСІ З XVI СТАГОДДЗЯ ДА 1917 ГОДА

**Сімакоў Аляксандр Васільевіч, краязнавец**
**г. Гомель, Республика Беларусь**

Ключавыя словы: Беларусь, індзейцы, літаратура, горад.

Рэферат. Апісваецца індзеянісцкая інфармацыя, якая захавалася ў гарадах Беларусі ў перыяд Новага часу.

Выявіць і ацаніць індзеянісцкую актыўнасць, цікавасць да індзейскай тэмы,

прысутнасць звестак пра індзейцаў у публікацыях, рукапісах і ў сувязі з артэфактамі, з абмежаваннем перыядам да пераходу да сацыялізму і гарадамі, дазваляюць найперш нашы матэрыялы, згрупаваныя па катэгорыях:

1. Друк у сучасных межах Беларусі.
2. Указанні на знаходжанне выданняў, надрукаваных за межамі Беларусі, у якіх ёсць індзеяністкая інфармацыя.
3. Звесткі з неапублікаваных матэрыялаў.

Мы згадваем ніжэй толькі нямногіх з асоб, што жылі ў беларускіх гарадах і заўважаныя ў кантактах з індзейцамі і/або значным укладзе ў індзеяністыку за межамі Беларусі. Таксама не пералічваем выпадкі чытання кніг пра індзейцаў і гульні ў індзейцаў.

Тэрміны «актыўнасць» і «цікавасць» у дачыненні да індзеяністыкі часам мае сэнс ужываць у двукоссях, як умоўныя, бо да 1960-х гг. для жыхароў Беларусі намі не фіксуецца індзеяністыка як спецыялізацыя або значны акцэнт у жыцці пэўных асоб.

У 2023 г. мы ўпершыню коратка падсумавалі тое, што звязвае жыхароў шляхецкіх сядзіб з індзейцамі. Вёскі, маёнткі і фальваркі (і выхадцы з сельскай мясцовасці ў замежжы) даюць у цэлым нават больш індзейскага матэрыялу. Тым не менш, напрыклад, выдавецтвы і друкарні – у асноўным гарадская з'ява. Таксама гімназіі і іншыя ўстановы для навучэнцаў сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту, якія маюць павышаную цікавасць да індзейцаў ужо ў XIX ст., адносяцца да гарадоў, але арэнай для гульняў гарадскіх дзяцей можа з'яўляцца лес каля горада або вёскі. Пры класіфікацыі населеных пунктаў з індзеяністкім кантэнтам і дзеяннем магчыма вылучыць пераходную групу з некаторых вялікіх і важных мястэчак – тым больш, што перад тым або пасля асобныя з іх былі гарадамі.

У якасці прыкладаў мы ўзялі абласныя цэнтры і некалькі з найбольш цікавых для нас у «індзеяністкіх» адносінах гарадоў па абласцях: Брэсцкая: Пінск; Віцебская: Орша, Полацк; Гомельская: Чачэрск; Гродзенская: Навагрудак, Слонім; Магілёўская: Бабруйск, Горкі, Крычаў, Шклоў; Мінская: Нясвіж, Слуцк, Радашковічы.

У Расіі ў асобных артыкулах і нават кнігах прасочваліся сувязі з Амерыкай асобных рэгіёнаў, абласцей (Курскай, Валагодскай, Валгаградскай і інш.). Польскія аўтары разглядзелі як цэнтр вывучэння геаграфіі свету і асобна цікавасці да Амерыкі, у прыватнасці, і Вільню. Працы, у загалоўках якіх прысутнічае матыў падобнай цікавасці, могуць быць праілюстраваныя публікацыямі Р. Урублеўскага з Лодзі, але выхадца з «усходніх крэсаў» [5; 6]. Сярод атрыманых намі ад яго 15.07.1991 г. асобных адбіткаў – яго артыкулы «Рэха геаграфічных адкрыццяў у працах Каперніка» (1974 г.), «Новы Свет – Заходнія Індыі – Амерыка. З гісторыі фарміравання польскай геаграфічнай наменклатуры ў эпоху Адраджэння» (1976 г.), «Польскія навуковыя асяродкі часоў Адраджэння ў адносінах да адкрыцця Амерыкі» (1976 г.) [5]. Ён аўтар артыкула «Падарожжы як крыніца ведаў пра Амерыку» (1972 г.) і кнігі «Веданне Амерыкі ў Польшчы перыяду Адраджэння» (1977 г.) [6]. Традыцыйна ў Польшчы выкарыстоўваць матэрыял з крэсаў, які значна ўзбагачае гісторыю польскай геаграфіі.

Прасочванне краіназнаўчай цікавасці ў асобных рэгіёнах Беларусі можа здавацца

даволі новым падыходам. Але не для гомельскай індзеяністыкі. Пытанне па рэгіёнах ставілася ўжо ў другой палове 1980-х гг., і першыя спробы зборак былі па Гомельшчыне, Віцебшчыне, а таксама Брэстчыне.

Надзвычай малая колькасць заўважаных твораў друку Беларусі з індзеянісцкімі згадкамі пацвярджае феномен, які развіўся ў сувязі з палітыкай у моўнай, адукацыйнай, выдавецкай сферах у часы Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі на тэрыторыі Беларусі.

Напрыклад, у нашай Беларуска-індзейскай бібліяграфіі, у якой на 21.04.2024 г. было 12716 запісаў, дагэтуль толькі дзве дарэвалюцыйныя кнігі на польскай мове, якія адносяцца да Беларусі па месцы выдання: «Аб асноўных артыкулах хрысціянскай веры» С. Буднага (Лоск, 1576 г.) і «Усеагульная гісторыя царквы» Ё. Альцага (т. 2, Пецярбург і Магілёў, 1855 г.).

Не нашмат лепш з рускамоўнымі публікацыямі: «Заметка о коллегии и академии иезуитов в Полоцке» (Витебск, 1890 г.) А. Сапунова; публікацыя творчасці І. Сакольскага, у т. л.: «Ода [...] белорусскому генерал-губернатору Петру Богдановичу Пассеку на посещение Полоцкого главного народного училища при случившемся в оном испытании 1789-го года декабря 7-го дня» (Труды Витебской ученой архивной комиссии. Кн. 1. 1909 г. – 31 мая 1910 г.. Витебск, 1910 г.; асоб. адб.: Віцебск, паміж 1910 і 1912 гг.; таксама ў: Полоцко-Витебская старина. Кн. 1. Витебск, 1911 г.).

Адзінкавыя згадкі індзейцаў заўважаныя намі ў беларускамоўнай перыёдыцы: толькі ў Цёткі (пад іншым псеўданімам А. Пашкевіч – М. Крапіўка: «Газа» (Лучынка. 1914 г. № 3)) і ў двух артыкулах Я. Лёсіка ў газеце «Вольная Беларусь» (Мінск) летам 1917 г. Калі не ўлічваць віленскі і пецярбургскі друк, то вынік надзвычай сціплы (пры тым, што гэтая карціна даволі «выбарачная» – спецыяльны пошук па вялікіх масівах беларускага дарэвалюцыйнага друку намі не рабіўся, але перспектыўных назваў па наяўных бібліяграфіях і бібліятэчных каталогах мы амаль не знаходзілі). У 1898 г. «Витебских губернских ведомостях» з'явіўся артыкул П. Стральцова «Востраў Куба» – экскурсы ў гісторыю вострава, на якім ваяваў, аўтар даваў. Першая беларуская і гродзенская газета – «Gazeta Grodzieńska», якая выдавалася паміж 1776 і 1783 гг., – цалкам не прагледжаная (найперш на прадмет сутычак з індзейцамі ў паслярэвалюцыйных ЗША).

Сярод найбольш цікавых з выдадзеных за ўвесь час знаходжання Беларусі ў складзе Расійскай імперыі кніг і брашур – выдадзены ў Гомелі «Нарыс гісторыі вялікіх геаграфічных адкрыццяў і паступовага вывучэння паверхні зямлі» (1914 г.) [1]. У ім аўтар, выконваючы абавязкі інспектара Гомельскай мужчынскай гімназіі Я. Селенс, піша, што «хаця ў некаторых іншых месцах зямнога шара, як у Кітаі, Індыі. Мексіцы, Перу, і вырысоўваліся на заранку гісторыі, дзяржавы, якія стаяць на высокай, на той час, ступені развіцця, але ўласцівая ім культура не ўліла сваіх ручаёў у тую раку, якая, узяўшы пачатак у Егіпце, пацякла шырока па Еўропе і разліваецца магутным патокам па ўсім зямным шары, робячыся набыткам усяго чалавецтва – сусветнай культурай» [1, с. 3].

Я. Селенс у прыватнасці згадвае спробы нарманаў-ісландцаў замацавацца на

паўночна-ўсходніх берагах Амерыкі: «Еўропай гэта адкрыццё было пакінутае без увагі і хутка забытае» [1, с. 9]. Ён адводзіць даволі шмат месца экспедыцыі Х. Калумба [1, с. 12–14], аднак пра «сустрэчу культур» або проста кантакт з карэннымі жыхарамі нічога не гаворыцца (адзіная прыкмета іх прысутнасці – «апрацаваны рукой чалавека шост і дошка» [1, с. 13]); далей аўтар піша пра падарожжы праваднікоў еўрапейскага «панавання» – П. Кабрала [1, с. 14], Дж. Кабата [1, с. 15], Ф. Магелана [1, с. 15–16], Дж. Кука [1, с. 19–20], І. Крузенштэрна, О. Кацэбу і Ф. Літке [1, с. 20], А. Гумбальта [1, с. 21], палярныя даследаванні Дж. Франкліна [1, с. 25].

Небеларускія кнігі, якія самімі сваімі загалоўкамі ўказваюць на індзейскую тэматыку ў іх, выяўленыя намі ў друкаваных каталогах кніг бібліятэк у Магілёве (Каталог книг Могилевской публичной библиотеки. Могилев, 1902 г.), Горках (Каталог книг Горецкой библиотеки. Горки, 1913 г.) і Мінску (Каталог Минской городской общественной библиотеки им. А. С. Пушкина 1908-й год. Минск, 1909 г.; Каталог Минской библиотеки Московско-Брестской ж. д. Минск, 1911 г.).

У 364 змешчаных у інтэрнэце з мая 2022 г. па красавік 2024 г. нашых біяграфічных артыкулах серыі «Беларусы сустракаюцца з індзейцамі» «кантакцёрамі» перыяду да канца 1917 г. і ўраджэнцамі гарадоў Беларусі з'яўляюцца (па вакабулах) толькі Ф. Дзеражынскі (Орша), М. Сабольскі, К. Румель (Гродна), М. Русель (Магілёў); таксама служачыя РАК на Алясцы С. Кумачоў і А. Пушкарэвіч у дакументах называюцца адпаведна віцебскім і магілёўскім мяшчанамі. Месцы нараджэння некаторых ураджэнцаў Беларусі невядомыя.

Прыклады па абласцях, якія ніжэй, адлюстроўваюць асобныя сюжэты, якія прыцягвалі нашу асаблівую ўвагу:

– Брэсцкая вобласць. А. Копаць на сейме пры прызначэнні яго кашталянам брэсцкім у 1643 г. (тэкст змешчаны ў кнізе «Свада польская» 1745 г.) згадаў «лямант няшчасных індзейцаў», вываз у Еўропу іспанцамі золата і ледзь не «ўсяго Новага Свету».

Пінск. З ім звязваюць ідэю, што палешукі – гэта своеасаблівыя польскія індзейцы (эпоха А. Нарушэвіча). Бацька згаданага гомельскага папулярызатара геаграфічных адкрыццяў Я. Селенса выкладаў геаграфію ў гімназіі Пінска. Нашы зносіны з журналістам і краязнаўцам М. Самуйлікам цікавыя тым, што ён змог звязаць з Піншчынай або, шырэй, Брэстчынай адразу некалькі «індзейскіх» прыкладаў, у прыватнасці прыгадаў маці Сат-Ока (С. Суплатовіча), якая не была рэвалюцыянеркай, у сувязі М. Багушэвіч, лідарам партыі «Пралетарыят», якая памерла некалькімі гадамі пазней пасля нараджэння першай, і У. Вербановіча. М. Самуйлік паведаміў нам пры сустрэчы 25.03.1987 г., што бачыў індзейца на бланкавай паперы, што адносілася да побыту У. Вербановіча ў ЗША (калі гаворка пра герб Індыяны, то гэта памылка, бо на ім адлюстраваны бізон і дрывасек еўрапейскага выгляду).

– Віцебская вобласць. Верагодна, у Віцебску вучыўся М. Сялява – падарожнік і зорка беларускай дыяспары.

Орша. Месца нараджэння кіраўніка езуітаў ЗША Ф. Дзеражынскага, а таксама месца вучобы тут у езуітаў паэта П. Шумахера.

Полацк. Важны «беларускі перыяд езуіцкага ордэна». Безумоўна,назіралася

вялікая ўвага да геаграфіі: выдадзены, між іншым, на польскай мове «Кароткі курс агульнай геаграфіі» і «Кароткі курс фізічнай геаграфіі».

– Гомельская вобласць. У Гомелі найбольш вядомы Д. Выгодскі, які дзейнічаў як іспаніст і лацінаамерыканіст у Пецярбургу, але не страчваючы гэтай цікавасці і на радзіме, куды прыязджаў і дзе працягваў публікавацца.

Чачэрск. У ім, як і ў некаторых іншых езуіцкіх цэнтрах на тэрыторыі вобласці, пры выкладанні геаграфіі вучні маглі даведацца пра індзейцаў. Гэта тычылася і выхадца з Чачэрска езуіта Я. Залескага.

– Гродзенская вобласць. Гродна дае шматлікія прывязкі да індзейцаў – праз скульптуры ў касцёле, напамін пра хіну ў аптэцы і іншае часоў Першай Рэчы Паспалітай. Другое дзесяцігоддзе 19 ст. адзначанае з'яўленнем у Канадзе групы асоб, у ліку якіх былі ўраджэнцы Гродна: М. Сабольскі (Sabolsky) і Ю. Лявоцкі (Лявоскі, Lewosky) удзельнічалі ў англа-амерыканскай вайне 1812–1814 гг. (дзяржавы-праціўнікі знайшлі саюзнікаў сярод індзейцаў – Марцін і Юзаф, як раней і Т. Касцюшка, не маглі не бачыць іх удзелу ў вайне). Некаторыя беларусы апісваюцца як тыя, што выконвалі абарончую задачу ў раёне еўрапейскіх пасяленняў на Рэд-Рывер у Манітобе.

Навагрудак. Важнае месца ў многіх адносінах, у т. л. служыць арыенцірам і для найбольш значных «прадстаўнікоў» Беларусі ў Паўднёвай (К. Карніцкі) і Паўночнай (А. Расадоўскі) Амерыцы, для якіх у Навагрудскім павеце або ваяводстве не ўказваецца канкрэтнае месца нараджэння.

Слонім. Тэатральная актыўнасць: хаця трагедыя Вальтэра «Альзіра, або Амерыканцы» выдадзеная ў Варшаве (1780 г.), нават у бібліяграфічным апісанні ёсць указанне, што яна перакладзеная для слонімскага тэатра (па прапанове гетмана М. К. Агінскага яго дарадцам І. Ляхніцкім).

– Магілёўская вобласць. Магіляўчанін М. Судзілоўскі (Русель) – добра задакументаваная асоба, таму ёсць некаторыя звесткі і пра тое, што ён чытаў пра індзейцаў на радзіме, і пра тое, з кім з індзейцаў мог сустракацца, і што сам пісаў пра індзейцаў. У публіцыстцы часам быў павярхоўны і крытычны ў адносінах да індзейцаў. Аднаму з блізкіх да яго руска-японскіх асоб – М. Мацвееву-Амурскаму – прыпісваецца паходжанне ад аляскінскай індыянкі. Праз аляскінскі матэрыял можна звязаць Руселя і яго сан-францыскіх знаёмых з магіляўчанкай, якая ў МАЭ займалася амерыканскімі калекцыямі, – С. Ратнер-Штэрнберг.

Бабруйск. Малавядомая ў Беларусі, але, магчыма, не менш значная фігура, чым доктар Русель, – Э. М. Эпштэйн з Бабруйска, таксама медык, які ў 1882 г. стаў першым прэзідэнтам Універсітэта Паўднёвай Дакоты. Ён меў «супярэчлівыя» рэлігійныя погляды, з пасады прэзідэнта зняты па палітычных прычынах, калі ў 1883 г. кантроль над універсітэтам перайшоў да ўладаў адной з самых «індзейскіх» тэрыторый. Яго праўнучка С. Л. Кер напісала гістарычны раман «Незвычайны доктар Эпштэйн» (The extraordinary Dr Epstein, 2015).

Горкі. І. Лінёў вучыўся ў Горы-Горацкім сельскагаспадарчым інстытуце, потым у Пецярбургу, а ў ЗША, сярод іншага, спрабаваў зарабляць забеспячэннем таварамі арміі і пасяленцаў у раёнах супрацьстаяння з індзейцамі.

Крычаў. Бацька падарожніка А. Галынскага выдаў «Усеагульную геаграфію»: «Всеобщая география. Изданная Действительным Статским Советником и Кавалером Голынским» (СПб., ч. 1, 1820; ч. 2, 1819 г.) цікавая актам, як згадана у ёй самой, «ахвяравання пяцісот асобнікаў гэтай [кнігі] для раздачы безграшова недастатковым гадаванцам навук Беларускіх і Уладзімірскай Губерняў, у якіх знаходзяцца мае маёнткі, выканаць мэту жадання майго, садзейнічаючы, хаця б збольшага, у распаўсюджванні гэтай карыснай навукі». Пад «Беларускімі» губернямі перш за ўсё маецца на ўвазе Магілёўская («Галынскі В.» у 1791 г. у Магілёве выдаў на польскай мове «Кароткія заўвагі аб некаторых азіяцкіх дзяржавах»»).

Шклоў. У 1797 г. Н. Г. Шульман, ураджэнец Старога Быхава, у Шклове падрыхтаваў [4, с. 66] перавыданне трактата Манасе бен-Ізраіля XVII ст. «Мікве Ісраэль» («Надзея Ізраіля»), у якой індзейцы звязваліся з дзесяццю легендарнымі страчанымі плямёнамі. Але для Н. Г. Шульмана, які задумаў і шклоўскае перыядычнае выданне на яўрэйскай мове (не рэалізаванае), каштоўнасць гэтага трактата для сучасных яму яўрэяў заключалася не ў месіянстве, а ў ведах па геаграфіі і этнаграфіі Амерыкі, якія пашыралі гарызонты звычайных вернікаў-іўдаістаў.

– Мінская вобласць. «Мінcград» – адно з месцаў дзеяння рамана А. Тышынскага «Амерыканка (г.зн. індыянка – А. С.) у Польшчы». У Мінску апісваюцца першыя паказы фільмаў пра індзейцаў.

Нясвіж. Не толькі з папулярнай аповесці Ю. Крашэўскага, але і ў даведніку па музеях у Польшчы С. Лорэнца вядомы як месца захоўвання прадметаў індзейцаў (калекцыі Радзівілаў).

Слуцк. Павятовы цэнтр і асабліва Капыль (у цікавы для нас перыяд яго статут паніжаны да мястэчка) з іх «ваколіцамі» – месцы, адкуль шмат яўрэяў і беларусаў пераехала ў Су-Сіці (Аява), а адтуль далей на захад. Сям'я Сінайкінах – найбольш вядомая з тых, што пасяліліся ў «Джу-Флэтс» паміж дзвюма вялікімі рэзервацыямі ў Паўднёвай Дакоце [2, с. 18; 3].

Радашковічы. Месца нараджэння Ю. Гарайна – аднаго з самых значных паланійных дзеячаў ЗША XIX ст., які звязаны з гісторыяй згаданага намі славутага М. Сялявы.

Нешматлікія па тагачаснай фіксацыі ў мясцовым друку ў параўнанні з краінамі-суседзямі, беларускія прывязкі да «ранняй» Амерыкі і індзейцаў, якія знойдзеныя намі, насамрэч багатыя і разнастайныя, але працэнт апрацаваных крыніц застаецца параўнальна малым. Аўтар гэтага паведамлення спадзяецца, што іншыя даследчыкі звернуць увагу на тэму «экзатычных» і недзяржаўных народаў у вопыце жыхароў і грамадскай думцы Беларусі ў XVI– пачатку XX стст. як яшчэ амаль не распрацаваную.

Спіс выкарыстаных крыніц:

1. Селенс, Е. Б. Очерк истории великих географических открытий и постепенного изучения поверхности земли / сост. Е. Селенс. – Гомель : типо-лит. Г.М. Бриля, 1914. – 29 с.

2. Сімакоў, А. Беларусы сустракаюцца з індзейцамі: [Вып. 89] / А. Сімакоў // Наша слова.pdf. – 2024. 25 сак. (№ 12) – С. 14-23. [Электронны рэсурс]. – Рэжым

доступу: https://www.nslowa.by/wp-content/uploads/2018/08/tts12.pdf#page=18 (Сінайкін (Сінайкіна) Фейга Эта). – Дата доступу: 19.03.2024.

3. Clarren R. The cost of free land : Jews, Lakota, and an American inheritance / R. Clarren. N. Y. : Viking, 2023. – 352 p.

4. Fishman, D. E. Russia's first modern Jews : the Jews of Shklov / D. E. Fishman. – New York : New York University Press, 1995. – XIII, – 195 p.

5. Wróblewski, R. Polskie środowiska naukowe czasów Odrodzenia wobec odkrycia Ameryki / R. Wróblewski // Acta Universitatis Lodziensis : Zeszyty naukowe Uniwersytetu Łódziego : Nauki matematyczno-przyrodnicze. – Seria II. – № 4. – S. 51–67.

6. Wróblewski R. Znajomość Ameryki w Polsce okresu Odrodzenia / R. Wróblewski. – Warszawa : Państwowe Wydawnictwo Naukowe, 1977. – 157, [2]

УДК 94

# ГОРОД И ЛЮДИ: ОБЩЕСТВЕННЫЕ БЛАГОТВОРИТЕЛИ ДЕТСКИХ ПРИЮТОВ В САНКТ-ПЕТЕРБУРГЕ ВО ВТОРОЙ ПОЛОВИНЕ XIX – НАЧАЛЕ XX ВВ.

**Синова Ирина Владимировна, доктор исторических наук, доцент,**
**старший научный сотрудник научно-образовательного центра краеведческих исследований**
**Ленинградский государственный университет им. А. С. Пушкина,**
**г. Санкт-Петербург, Российская Федерация**

Ключевые слова: благотворительные заведения для детей, Санкт-Петербург, общественные деятели.

Реферат. В статье как часть облика города рассматриваются вопросы детской благотворительности во второй половине XIX – начале XX вв. В исследовании на примере города Санкт-Петербурга показано, что в данный период происходило активное формирование гражданского общества, которое выразилось в активном участии разных категорий горожан в помощи нуждающемуся.

Любой город – это прежде всего люди, и, в первую очередь, те, которые пытаются сделать его лучше, способствуют решению его проблем и процветанию, помогают нуждающимся, влияют прямо или косвенно, позитивно или негативно на его развитие. Поэтому история города начинается с его жителей, с их вклада и влияния на его судьбу. И здесь особая роль в каждом российском городе во второй половине XIX – начале XX вв. принадлежала благотворителям, тем, кто просто оказывал бескорыстную помощь нуждающимся, но и вкладывал в это всю свою душу. Среди них графиня Ю. П. Строганова, К. К. Грот, А. С. Балицкая, В. Н. Герард, А. П. Философова, Б. И. Бентовин и многие другие. При этом для осуществления благотворительной